Дрэма, В. ТОП-БІЗНЕСОЎЦЫ ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ: кіраўнік кампаніі “КонтеСпа” Валянцін Байко // Сайт “Твой стыль”(http://www.t-styl.info).- 30.12.2014.

“Твой стыль” пачынае знаёміць гарадзенцаў з лідарамі гэтага прэстыжнага рэйтынгу “ТОП-БІЗНЕСОЎЦЫ ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ”.

Пачынаем з лідара рэйтынгу - **кіраўніка кампаніі “Конте Спа” Валянціна Байко.**

**У 1997 годзе разам з бацькам, братам і яшчэ некалькімі партнёрамі ён купіў два станкі, на якіх распачаў вытворчасць панчох. Сёння ён узначальвае ТОП-50 самых паспяховых бізнесоўцаў Гарадзеншчыны па версіі ej.by.**

.




**ПЯЦЬ ФАКТАЎ ПРА ВАЛЯНЦІНА БАЙКО**

1. Да таго, як распачаць бізнес, выкладаў у школе.
2. Акрамя вытворчых пляцовак у Гродне кампанія Байко выкупіла ў 2013-2014 гг. Брэсцкі панчошны камбінат.
3. Байко і яго сям'і належаць некалькі вядомых у Гродне забаўляльных установаў і рэстаранаў (“База”, “Метро”, Basta Pasta), а таксама сетка крамаў касметыкі і бытавой хіміі Optima.
4. Байко ачольвае абласную філію Беларускай федэрацыі веславання.
5. У снежні 2013 г. Валянцін Байко быў прызначаны **ганаровым консулам** у адчыненым у Гродне Ганаровым консульстве Украіны. Сайт “Контэ Спа” мае раздзел з інфармацыяй пра прадпрыемства па-украінску.

Мінулым летам Валянцін Байко заняў пачэснае **4-е месца ў рэйтынгу** лепшых прадпрыймальнікаў краіны па выніках першага квартала. За гэты перыяд яго кампанія “Контэ Спа” зарабіла 62 787 млн рублёў.

Кампанія “Контэ Спа” (Conte Spa) была створана ў 1997 годзе. Спецыялізуецца на вытворчасці панчошна-шкарпэтачнай прадукцыі і трыкатажу для жанчын, мужчын і дзяцей.




Разам з шырока вядомай жаночай гандлёвай маркай Conte elegant кампанія актыўна прасоўвае на рынку мужчынскі брэнд DiWaRi і дзіцячы Conte-Kids.